Праграма тэлебачання на наступны тыдзень.

20 КАНАЛАЎ

Зямля пад жураўлінымі крыламі

СТАР. 6

Міфы аб працаздольнасці пажылых людзей

СТАР. 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

25 КАСТРЫЧНІКА 2013 г. ПЯТНІЦА № 202 (27567) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

РАЗАМ МЫ МАЦНЕЙ

Развіццё інтэграцыі павінна ўяўляць рух наперад у ліквідацыі любых бар'ераў

Фота БЕЛТА.

Развіццё інтэграцыі павінна ўяўляць рух наперад у ліквідацыі любых бар'ераў на шляху ўсебаковага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Пра гэта заявіў учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, якое прайшло ў Палацы Незалежнасці, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка са шкадаваннем заўважыў, што сёння, нягледзячы на праведзеную работу, колькасць выключэнняў і абмежаванняў не зменшылася, па некаторых напрамках нават ўзрасла. «Мы не можам плённа рухацца далей, не выканаўшы нашы папярэднія дамоўленасці. Не дасягнуўшы тых прагматычных або, калі хочаце, практычных мэт інтэграцыі, пра якія мы неаднаразова заяўлялі», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што асноўным пытаннем пасяджэння з'яўляецца падрыхтоўка праекта дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. «Ад таго, які дагавор мы створым, будзе залежаць і поспех нашага новага інтэграцыйнага аб'яднання, і яго прывабнасць для іншых краін», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. На яго думку, гэта наўпрост паўплывае на развіццё ўзаемаадносін паміж дзяржавамі вялікага рэгіёна.

Беларускі Прэзідэнт упэўнены, што не варта баяцца перадачы дадатковых паўнамоцтваў у Мытным саюзе на наднацыянальны ўзровень. «Суверэнітэт — не ікона. Усё мае сваю цану. І калі мы хочам жыць лепш, то трэба недзе саступіць, нешта ахвяраваць. Галоўнае — гэта дабрабыт людзей», — лічыць беларускі лідар. На думку Прэзідэнта Беларусі, тое ж тычыцца і архітэктуры будучага саюза — структуры органаў і механізмаў прыняцця рашэнняў. «Гэтыя кампаненты павінны быць зразумелымі, аптымальнымі і, галоўнае, — эфектыўнымі», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы, дадаўшы, што функцыі камісіі *(Еўразійскай эканамічнай камісіі.* — **Заўвага БЕЛТА***)* не павінны размывацца.

«Мы ствараем не міждзяржаўнае ўтварэнне, а сумесны орган дзяржаўнага кіравання, які павінен прымаць рашэнні кожны дзень. І гэтыя рашэнні павінны выконвацца на ўсёй тэрыторыі нашага саюза», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт Беларусі лічыць сімвалічным, што ў Мінску атрымліваюць пуцёўку ў жыццё найбольш важныя інтэграцыйныя рашэнні. Так, з прыняццем у лістападзе 2009 года ў беларускай сталіцы Мытнага кодэкса і Адзінага мытнага тарыфу пачалося практычнае функцыянаванне Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі.

«У кожнага партнёра, вядома ж, сваё бачанне перспектыў. Гэта нармальна. Аднак мы абавязаны знайсці тыя рашэнні, якія задавальняюць усіх. На наш погляд, гэта магчыма», — адзначыў беларускі лідар.

Беларусь, безумоўна, вітае далучэнне да Мытнага саюза новых партнёраў. Гэта робіць яго больш устойлівым. Таму дзверы ў наша аб'яднанне заўсёды адкрыты і для іншых краін», — сказаў беларускі лідар». Мы бачым намер Арменіі далучыцца да нашага інтэграцыйнага аб'яднання. Аднак трэба дакладна разумець, што Арменіі і іншым неабходна прарабіць той жа шлях інтэграцыі, які ўжо прайшлі Беларусь, Казахстан і Расія, і прыняць на сябе ўсе абавязацельствы ў поўным аб'ёме без усялякіх выключэнняў».

Што тычыцца Украіны, то Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў важнасць таго, каб яна, рухаючыся ў бок ЕС, не закрыла для сябе магчымасць удзелу ў Мытным, а ў далейшым — і ў Еўразійскім эканамічным саюзе. «Гэта няпростыя пытанні. Па іх нам трэба будзе знайсці ўзважаныя рашэнні, — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Мы павінны даць выразны сігнал нашым урадам, у якім кірунку ім рухацца далей». «Як прапанаваў Нурсултан Абішавіч Назарбаеў, па тых спрэчных пытаннях, якія ў нас, безумоўна, ёсць, трэба не хапаць адзін аднаго за грудкі і трэсці, а даручыць спецыялістам, урадам у сцісłыя тэрміны, каб не парушаць нашых дамоўленасцяў па далейшым руху наперад, выпрацаваць прымальныя рашэнні, магчыма, на падставе кампрамісаў», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Прэзідэнт Беларусі запрасіў калег выказацца па актуальных пытаннях інтэграцыі.

Прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін заявіў, што Расія гатова да самага цеснага інтэграцыйнага ўзаемадзеяння. Паводле яго слоў, на фоне агульнага запаволення тэмпаў росту ў свеце макраэканамічныя паказчыкі ў «тройцы» выглядаюць дастаткова прымальна. «Крызісныя з'явы ў сусветнай эканоміцы, вядома, не абышлі бокам і нашы дзяржавы, але, каб пераадолець іх, неабходна і далей умацоўваць інтэграцыю, удасканальваць наш агульны рынак тавараў і паслуг, паляпшаць умовы вядзення бізнесу», — адзначыў расійскі Прэзідэнт. «Расія выходзіць менавіта з такой логікі і гатовая да самага цеснага ўзаемадзеяння», — падкрэсліў Уладзімір Пуцін.

«Тое, што мы пакуль не дасягнулі па некаторых пазіцыях таго, аб чым дамаўляліся раней, вядома, сумна, я тут згодны з калегамі, трэба ў гэтым кірунку рухацца і дамагацца тых мэт, якія мы перад сабой паставілі. Як мы дамаўляліся на сустрэчы ў Астане, трэба, безумоўна, працаваць над ліквідацыяй выключэнняў і нейкіх узаемных прэферэнцый. Трэба ствараць роўныя ўмовы, — заявіў Уладзімір Пуцін. — Гэта вялікая праца, але яна павінна быць з двухбаковым рухам. Павінен быць кампраміс».

Па словах расійскага Прэзідэнта, неабходна весці гаворку аб стварэнні еўразійскіх сетак у сферах энергетыкі, транспарту, тэлекамунікацый. «Такое збліжэнне забяспечыць самыя спрыяльныя ўмовы для развіцця патэнцыялу нашых эканомік. Наўрад ці ў каго ёсць сумненні, што рэгіянальная інтэграцыя (увесь свет ідзе па гэтым шляху) — найбольш дзейсны сродак для максімальнага выкарыстання ўнутраных рэсурсаў росту, павышэння канкурэнтаздольнасці на сусветных рынках. Разам мы мацней і нам прасцей рэагаваць на глабальныя выклікі», — упэўнены Уладзімір Пуцін.

«Толькі што гаварылася, што мы павінны вельмі акуратна падыходзіць да пашырэння нашага саюза. Цалкам з гэтым згодны. І ўмовы павінны быць для ўсіх аднолькавыя. Мы ў вузкім складзе пра гэта казалі і пагадзіліся з гэтай пазіцыяй», — адзначыў Прэзідэнт Расіі. Гаворачы пра цікавасць трэціх краін да супрацоўніцтва з Мытным саюзам, Уладзімір Пуцін адзначыў, што цікавасць праяўляе буйная сусветная эканоміка — Індыя. На думку расійскага Прэзідэнта, улічваючы аб'ёмы і маштабы індыйскага рынку, перспектывы развіцця Азіі ў цэлым, бакам неабходна паставіцца да гэтай прапановы самым сур'ёзным чынам.

Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў прапанаваў прыняць Турцыю ў Мытны саюз, заявіў ён на пасяджэнні.

«Чуў, ужо шмат хто кажа, што, напрыклад, Сірыя хоча ўступіць *(у Мытны саюз.* — **Заўвага БЕЛТА***)*. Прэм'ер-міністр Турцыі Эрдаган звярнуўся да мяне: ці нельга Турцыю прыняць у Мытны саюз?» — сказаў Прэзідэнт Казахстана. Нурсултан Назарбаеў станоўча адазваўся аб такой магчымасці. «Турцыя — вялікая краіна, у нас ёсць супольная мяжа. І адпала б крытыка. Куды на Захад ні паедзеш, адразу задаюць пытанне: вы ствараеце Савецкі Саюз ці нешта там ствараеце пад Расію? І даводзіцца тлумачыць, што нічога падобнага няма», — зазначыў казахстанскі лідар. «Можа быць, Турцыю прыняць — і пытанні скончацца», — прапанаваў ён.

Дарэчы, паводле яго слоў, Казахстан мае пэўныя цяжкасці пры ўступленні ў СГА з-за дамоўленасцяў у рамках Мытнага саюза. «Вельмі сур'ёзнае пытанне — гэта ўступленне Казахстана ў СГА, — сказаў Нурсултан Назарбаеў. — Мы цалкам ішлі ў фарватары Расіі, нам была абяцана падтрымка пры ўступленні ў СГА. Балійская канферэнцыя будзе сёлета ў снежні. Казахстан там мог бы ўжо ўступіць, але мы не можам, таму што падтрымалі ўзровень абароны Расіі. Гэта, напэўна, больш пытанне паміж Расіяй і Казахстанам, але гэта тычыцца і Беларусі».

Ён таксама адзначыў наяўнасць недахопаў у рабоце Еўразійскай эканамічнай камісіі. «Назіраецца відавочная палітызацыя работы камісіі, распыленне сродкаў і намаганняў на паглыбленне інтэграцыйных працэсаў», — заявіў Прэзідэнт Казахстана. Нурсултан Назарбаеў канстатаваў, што незалежна ад наяўнасці нявырашаных пытанняў і задач адбываюцца спробы штучна падштурхнуць працэс: «Давайце зробім тое, пра што мы дамовіліся, а потым ужо будзем глядзець далей». «Таму нельга дапускаць з боку камісіі парушэнняў прынцыпаў рэгламенту работы. Нярэдка дакументы камісіі паступаюць на ўзгадненне за адзін дзень да прыняцця рашэння. Не магу не адзначыць, што расійскія члены Калегіі прымаюць удзел у пасяджэннях урада Расіі і атрымліваюць адпаведную ўстаноўку, хаця, згодна з нашым дагаворам, Камісія, члены Калегіі не падсправаздачны ніякаму з нашых урадаў», — заўважыў Нурсултан Назарбаеў.

«Трэба завяршыць работу над ужо падпісанымі дагаворамі. Па транспартаванні нафты і газу падпісалі — не вырашаецца, па чыгуначных тарыфах не вырашаецца, па электраэнергіі не вырашаецца. Давайце засяродзімся на гэтым. Не выканаўшы тое, пра што мы дамовіліся, — крочыць далей? Хто нас гоніць? Час ёсць», — лічыць казахстанскі лідар.

Прэзідэнты мытнай «тройкі» таксама заявілі аб неабходнасці захаваць частку нарматыўнай базы ЕўрАзЭС. Тут ёсць некалькі дзясяткаў міжнародных дагавораў, якія тычацца членаў мытнай «тройкі». Казахстанскі лідар у гэтай сувязі прапанаваў падоўжыць іх дзеянне, адаптаваць да Мытнага саюза альбо прыняць нанова.

«Ставіцца пытанне, што будзе з членамі гэтай арганізацыі *(ЕўрАзЭС.* — **Заўвага БЕЛТА***)*, куды ўваходзяць таксама Кыргызстан і Таджыкістан. Трэба дамовіцца. Можа, яны будуць назіральнікамі, калі мы не хочам нейкім чынам вызначыць іх статус».

Што тычыцца далейшага лёсу ЕўрАзЭС, Уладзімір Пуцін пагадзіўся з пазіцыяй Прэзідэнта Казахстана і падкрэсліў недапушчальнасць страты нарматыўна-прававога падмурка, на якім у тым ліку стаіць Мытны саюз. «Мы не можам проста так ліквідаваць ЕўрАзЭС, інакш мы падарвем прававую аснову Мытнага саюза», — сказаў Прэзідэнт Расіі.

ЦЫТАТА ДНЯ

Георгій ГРЫЦ, намеснік старшыні Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі:

«Саміты кіраўнікоў дзяржаў СНД, якія праходзяць у Мінску, лічу, стануць сапраўды лёсавызначальнымі. Гэта свайго роду аб'яднанне супрацьлегласцяў. Саміт — добрая магчымасць зверыць гадзіннікі і паспрабаваць знайсці баланс інтарэсаў. Гэта вельмі важна. І нават калі за гэтыя два дні не атрымаецца вырашыць усе існуючыя пытанні, падчас самітаў будуць закрануты інтарэсы і Беларусі, і Расіі, і Казахстана. Ускосна, на маю думку, можа быць закранута і пытанне Украіны: Украіна — ЕС або Украіна — АЭП».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.10.2013 г.

Долар ЗША	9160,00	▲
Еўра	12620,00	▲
Рас. руб.	289,50	▲
Укр. грыўня	1121,66	▲

■ Надвор'е

НЕКАЛЬКІ ДЗЁН АНАМАЛЬНАЙ ЦЕПЛЫНІ

На выхадныя тэмпературны фон будзе на 5-10 градусаў вышэй за норму.

Напрыканцы тыдня на тэрыторыю Беларусі завітае даволі цёплае паветра з боку паўднёвага захаду Еўропы. Таму ў пятніцу пры павышаным атмасферным фоне істотных ападкаў у краіне не чакаецца, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Максімальная тэмпература паветра ўдзень 9-15 градусаў. На наступны дзень да нас «зацягне» невялікі атмасферны фронт. Тэмпература паветра ўначы на суботу плюс 2-8 градусаў, па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці да 10 цяпла, удзень — 9-15, а па паўднёвым захадзе Беларусі — плюс 9-17 градусаў. У нядзелю пад уплывам зоны паніжанага атмасфернага ціску ўначы ў паўночных і цэнтральных раёнах, а ўдзень месцамі невялікія дажджы. Уначы на нядзелю тэмпературны фон павялічыцца да 7-12 цяпла, удзень чакаецца ўжо 12-17 градусаў вышэй за нуль.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, захаваецца анамальна цёплае надвор'е і на пачатку наступнага тыдня.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Парламенцкі дзённік

ПАДТРЫМАЦЬ І НЕ СТРАЦІЦЬ

На ўчарашнім пасяджэнні трэцяй сесіі Палата прадстаўнікоў разгледзела блок законапраектаў у эканамічнай сферы. Сярод іх: Дэкрэт № 5, які карэкціруе леташні Дэкрэт № 6 аб стымуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў і сельскай мясцовасці; змяненні ў закон аб банкруцтве; праект закона аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і змены ў закон аб натуральных манаполіях.

«Зарабляем — і цудоўна»

— Галоўны напрамак дэкрэта аб стымуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадоў і сельскай мясцовасці застаецца ранейшым, — патлумачыў журналістам **Міністр эканомікі Беларусі Мікалай СНАПКОЎ.** — Развіццё малога і сярэдняга бізнесу, развіццё канкрэтных вытворчасцяў, якія вырабляюць прадукцыю і аказваюць паслугі ў рэгіёнах, захоўваецца. Аднак практыка прымянення дэкрэта паказвае, што льготы, якія распаўсюджваюцца на ўвоз тэхнікі, ствараюць умовы несправядлівай канкурэнцыі для тых беларускіх прадпрыемстваў, якія вырабляюць аналагічную тэхніку. У сваёй аснове карэкціроўкі накіраваны на выключэнне атрымання мытных льгот для тых відаў тэхнікі, якія вырабляюцца ў нашай краіне, і на канцэнтрацыю намаганняў па стварэнні рэальных вытворчасцяў у сельскай мясцовасці і малых гарадах.

Міністр эканомікі расказаў дэпутатам пра вынікі прымянення Дэкрэта № 6 ад 7 мая 2012 года, які ён назваў беспрэцэдэнтным з пункту погляду льгот для арганізацыі ўласнага бізнесу ў сярэдніх, малых гарадах і сельскай мясцовасці. Ён нагадаў, што гэты дэкрэт накіраваны перш за ўсё на развіццё канкурэнтаздольнасці рэгіёнаў, рызыка развіцця якіх з'яўляецца сёння сумнай рэальнасцю. Па падліках галоўнага эканамічнага ведамства краіны, да 2032 года больш за 40% раёнаў Беларусі будуць мець колькасць насельніцтва менш за 20 тысяч чалавек, што ставіць пад сумненне магчымасць нармальнага іх функцыянавання.

Менавіта таму апошнім часам урад і Міністэрства эканомікі прыкладаюць усе намаганні для развіцця бізнесу менавіта ў рэгіёнах. За невялікі прамежак часу, які прайшоў пасля прыняцця Дэкрэта №6, колькасць суб'ектаў гаспадарання, зарэгістраваных на тэрыторыі малых гарадскіх паселішчаў і сельскай мясцовасці, узрасла на 14 тысяч адзінак (або на 15%). У той жа час у буйных гарадах гэты паказчык вырас усяго на 6%. Пры гэтым у рэгіёнах расце колькасць менавіта камерцыйных прадпрыемстваў, на што і быў накіраваны дэкрэт. Трохі больш чым за год у малых гарадах і сельскай мясцовасці было створана каля 80 тысяч новых працоўных месцаў. Для параўнання, падчас 3-гадовага дзеяння паскоранай індустрыялізацыі ў Казахстане было створана толькі 36 тысяч новых працоўных месцаў.

У 2012 годзе сума падатковых льгот у рамках Дэкрэта № 6 склала 70 млрд рублёў, пры гэтым у бюджэт было пералічана больш за 132 млрд рублёў. Гэта значыць, што аддача ад стымулявання прадпрымальніцтва ў рэгіёнах перавышае выдаткі дзяржавы, чаго няма на многіх дзяржаўных прадпрыемствах, калі выдаткі на іх падтрымку перавышаюць тыя сумы, якія яны адлічваюць у бюджэт, заўважыў міністр эканомікі. Прымяненне Дэкрэта № 6 садзейнічала і росту прамых замежных інвестыцый у асноўны капітал, агульная сума якіх склала 2,8 трл рублёў. З іх 2,5 трл — за кошт грузавога транспарту. «Гэта, у прынцыпе, той нюанс, тая супярэчлівасць, з-за якой і ўнесены Дэкрэтам №5 змены ў Дэкрэт №6, якія датычацца ў асноўным грузавога транспарту», — сказаў дэпутатам Мікалай Снапкоў.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ЕС ЗА РЫСАЙ БЕДНАСЦІ ЖЫВУЦЬ 84 МЛН ЧАЛАВЕК

У Еўрасаюзе за мяжой беднасці жывуць каля 84 млн чалавек, што складае амаль 17% ад усяго насельніцтва краін, якія ўваходзяць у саюз. Пра гэта паведаміла прэс-служба Еўракамісіі. Паводле ацэнак ЕК, працэс выхаду Еўропы з крызісу можа зацягнуцца на бліжэйшыя 10 гадоў. Сёння 26 млн чалавек у Еўрасаюзе з'яўляюцца беспрацоўнымі. «У некаторых найбольш пацярпелых ад крызісу краінах мы бачым рост экстрэмізму, дэмагогіі і забабонаў. Стымулюючы эканамічны рост, нельга забываць пра рост справядлівасці», — заявіў Лука Джахер, старшыня Еўрапейскага сацыяльна-эканамічнага камітэта. На думку экспертаў, фінансавы і эканамічны крызіс у ЕС перарос у крызіс сацыяльны і дэмакратычны. З гэтым звязаны таксама крызіс даверу да ЕС у цэлым. Паводле статыстыкі, цяпер толькі 31% насельніцтва Еўрасаюза верыць у ідэі аб'яднання.

У ЗША ПАЛІЦЭЙСКІЯ ЗАСТРЭЛІЛІ ПАДЛЕТКА З ЦАЦАЧНЫМ АЎТАМАТАМ

У ЗША паліцэйскія застрэлілі 13-гадовага падлетка, прыняўшы цацачны аўтамат у яго руках за сапраўдны, паведамляюць інфармагенцтвы. Двое паліцэйскіх, якія патрулявалі раён у горадзе Санта Роуз (штат Каліфорнія), здалёк убачылі хлопчыка, які трымаў у руках цацачны аўтамат. Адзначаецца, што супрацоўнікі праваахоўных органаў не зразумелі, што чалавек з аўтаматам — дзіця. Па адной з версій, паліцыянты запатрабавалі, каб Круз (так звалі хлопчыка) кінуў зброю на зямлю. Аднак, не чакаючы рэакцыі падлетка, адзін са служыцеляў закона адкрыў агонь. Па іншай версіі, паліцыянты загадалі падлетку пакласці зброю двойчы. Але, па іх словах, хлопчык толькі павярнуўся ў іх бок і пачаў падымаць зброю. Паліцэйскі быў вымушаны адкрыць агонь. Ад атрыманых раненняў падлетак памёр на месцы.

У ІНДАНЕЗІІ ТЫСЯЧЫ ЧАЛАВЕК ЭВАКУІРАВАНЫ З-ЗА ВЫВЯРЖЭННЯ ВУЛКАНА

У Інданезіі ў чацвер пачалося вывяржэнне вулкана Сінабунг у правінцыі Паўночная Суматра. Гара выкінула слуп чорнага попелу, які дасягнуў трох кіламетраў у вышыню. Апусціўшыся, ён тоўстым пластом пакрыў бліжэйшыя вёскі і фермы, паведамляе The Jakarta Globe. «Першае вывяржэнне адбылося прыкладна ў гадзіну ночы, другое — каля 4 гадзін раніцы», — цытуе выданне паведамленне Нацыянальнага агенцтва па прадухіленні і ліквідацыі наступстваў стыхійных бедстваў. Паведамленняў аб загінулых або пацярпелых не паступала. Як перадае ABC News, улады эвакуіравалі больш за 3300 чалавек, якія жылі па суседстве з гарой у раёне Каро. Чыноўнікі таксама заклікалі турыстаў трымацца далей ад небяспечнай зоны і не набліжацца да вулкана бліжэй, чым на 1,5 км.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

КАВАМАНЫ РАДЗЕЙ ХВАРЭЮЦЬ НА РАК ПЕЧАНІ

Калі кожны дзень выпіваць па тры кубкі кавы, то можна знізіць рызыку раку печані больш чым на 50%, піша The Indian Express. У прыватнасці, кава памяншае верагоднасць развіцця гепатацэлюлярнай карцыномы (самага распаўсюджанага тыпу раку печані) прыкладна на 40%. Рак печані стаіць на шостым месцы па распаўсюджанасці сярод ракавых захворванняў у свеце. Гэта трэцяя самая частая прычына смерці ад раку. На гепатацэлюлярную карцыному прыпадае больш за 90% выпадкаў раку печані. Апошняе даследаванне ўплыву кавы на рызыку раку пацвярджае раней праведзеныя. Аўтар працы Карла Ла Векія лічыць, што пазітыўны ўплыў кавы можна часткова растлумачыць яе даказанай здольнасцю прадухіляць дыябет. А дыябет з'яўляецца ключавым фактарам рызыкі раку печані. Плюс, як вядома, кава абараняе ад цырозу і пазітыўна ўплывае на энзімы печані.

КАРАТКА

У сувязі з правядзеннем у Мінску Савета кіраўнікоў СНД 25 кастрычніка будуць уводзіцца часовыя абмежаванні руху па праспекце Незалежнасці, праспекце Пераможцаў, Мінскай кальцавой аўтадарозе, вуліцы Арлоўскай.

3, 4 і 5 студзеня ў Мірскім замку будуць арганізаваны стылізаваныя калядныя балі. Рэтрасалон у стылі джаз чакае гасцей 4 студзеня, а 5 студзеня пройдзе дзіцячы баль.

Чэмпіён Алімпійскіх гульняў 2008 года ў Пекіне па цяжкай атлетыцы беларус Андрэй Арамнаў не выступіць на чэмпіянаце свету-2013 у польскім Вроцлаве з-за пашкоджання цягліц сцягна, атрыманых на адной з апошніх трэніровак перад выездам на турнір.

Былы дырэктар ДУ « Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр гігіены» падазраецца ў прычыненні ўрону дзяржаўнаму бюджэту на суму больш як Br1 млрд.

Выбітная балерына, мастацкі кіраўнік балета Тбіліскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета імя З. Паліяшвілі Ніна Ананіяшвілі паставіць у Мінску спектакль «Лаўрэнс» на музыку Аляксандра Крэйна. Прэм'ера намечана на кастрычнік 2014 года.

ПАДАХОДНЫ ПАДАТАК «АТРЫМАЕ» АДЗІНЫЯ ПАДЫХОДЫ

Якія даходы фізічнай асобы з'яўляюцца аб'ектам абкладання падаходным падаткам? У якіх выпадках прымяняецца вызваленне ад падаходнага падатку? Ці мае фізічная асоба права на падатковыя вылікі? На гэтыя і іншыя пытанні аб асаблівасцях падаткаабкладання даходаў фізічных асоб падатковымі агентамі на сайце БЕЛТА адказвае намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Святлана ШАЎЧЭНКА.

— Якія змены прадугледжваюцца ў праекце закона, што ўносіць змяненні і дапаўненні ў Падатковы кодэкс у дачыненні да падаходнага падатку ў наступным годзе?

На гэты конт Святлана Шаўчэнка адзначыла, што цяпер распрацаваны законапраект, які прадугледжвае ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у Падатковы кодэкс, якія тычацца ў тым ліку падаходнага падатку. У выпадку яго прыняцця гэтыя змены ўступяць у сілу з 1 студзеня 2014 года. Згодна з праектам прапануецца ўстанавіць адзіныя падыходы да вызначэння падатковай базы падаходнага падатку пры атрыманні фізічнымі асобамі ад арганізацый і іншых фізічных асоб даходаў у натуральнай форме ў выглядзе капітальных пабудоў (напрыклад, у выпадку дарэння нерухомай маёмасці).

У прыватнасці, законапраектам прапануецца вызначыць, што пры атрыманні фізічнымі асобамі ад арганізацый даходаў у выглядзе капітальных пабудоў падлік падаходнага падатку будзе ажыццяўляцца, зыходзячы з кошту, вызначанага ў памеры не ніжэйшым за кошт, які ўжываецца для вылічэння падатку на нерухомасць фізічным асобам. Цяпер у такім парадку вылічваецца падаходны падатак з даходаў, атрыманых грамадзянамі ў выглядзе капітальных будынкаў ад іншых фізічных асоб.

Прапануецца таксама ўдасканаліць парадак падаткаабкладання даходаў, атрыманых фізічнымі асобамі па аперацыях з каштоўнымі паперамі і фінансавымі інструментамі тэрміновых здзелак. У прыватнасці, у артыкуле 160 Падатковага кодэкса дадзены азначэнні фінансавага інструмента тэрміновых здзелак, вытворных фінансавых інструментаў, а таксама вызначана, што прызнаецца даходамі па аперацыях з каштоўнымі паперамі, базісным актывам фінансавых інструментаў тэрміновых здзелак і выдаткамі па такіх аперацыях, рэгламентаваны парадак вызначэння падатковай базы і ўдакладнены парадак вылічэння і выплаты падаходнага падатку па такіх аперацыях.

СТАР. 2